# Літаратуразнаўства

*І.Р.СЦЯПУНІН*

## А.С.ПУШКІН НА ВІЦЕБШЧЫНЕ




Яшчэ пры жыцці А.С.Пушкіна першым прапагандыстам яго паэзіі на Віцебшчыне быў выкладчык матэматыкі Аршанскага павятовага вучылішча Аляксандр (па іншых архіўных крыніцах – Пётр) Лубкін. "Цудоўны хлопец, вельмі добрага складу думак, высакародны, за свой незалежны, няўхільны характар многа пацярпеў ад начальства", – так характарызаваў яго сябар, вядомы паэт і рэвалюцыянер Тадэвуш Лада-Заблоцкі. Пасля заканчэння Маскоўскага універсітэта ў 1833 г. Лубкін быў накіраваны настаўнікам у Беларусь. З Масквы ў Віцебск ён дастаўляў пісьмы Заблоцкага і іншыя матэрыялы. Паводзіны Лубкіна выклікалі падазрэнне паліцыі, на яго кватэры пры вобыску былі знойдзены рукапісны тэкст верша Пушкіна "Деревня" ("Приветствую тебя, пустынный уголок"), аднаго з самых выдатных твораў вольналюбівай лірыкі вялікага паэта. Пушкінскі верш распаўсюджваўся сярод перадавой інтэлігенцыі Віцебскай губерні[1].

Творы Пушкіна наогул знаходзілі ўдзячных чытачоў на Віцебшчыне. Віцябчане прымалі актыўны ўдзел у падпісцы на першае пасмяротнае выданне твораў Пушкіна 1838–1841 гг., з 1870 г. былі ўключаны ў кампанію па збору ахвяраванняў на збудаванне помніка Пушкіну ў Маскве. Галоўнымі ахвяравальнікамі былі чыноўнікі, купцы, дробныя гандляры, сяляне, афіцэры і салдаты гвардзейскіх палкоў, якія кватаравалі ў Віцебскай губерні[2].

Вельмі ўрачыста прайшло ў Віцебску ў 1899 г. святкаванне стогадовага юбілею Пушкіна. 30 мая (старога стылю) на Юр'евай гары праходзілі народныя гулянкі, іграў ваенны аркестр, ладзіліся масавыя забавы для народа. Продаж спіртовых напояў быў забаронены спецыяльным камітэтам апекі аб народнай цвярозасці[3].

27 мая ў віцебскім гарадскім тэатры адбыўся літаратурна-музычны вечар. Уваход у тэатр быў бясплатны. Мастацкае чытанне вершаў Пушкіна суправаджалася тут дэманстрацыяй нерухомых карцінак з дапамогай праекцыйнага апарата. Ваенны аркестр выконваў кантату ў гонар Пушкіна, спецыяльна напісаную мясцовым кампазітарам М.В.Анцавым на словы вучня VI класа віцебскай гімназіі У.Грэкава. Кантата паўтаралася некалькі разоў па патрабаванні публікі[4].

На святочным вечары мясцовы паэт Г.А.Тэадаровіч адзначаў, што Пушкін у сваіх творах "вольность предрекал народу, скорбел о родине душой и за распятую свободу не раз вступал в горячий бой". Услаўленне Пушкіна як барацьбіта за вольнасць было невыпадковым, як і публікацыя ў "Витебских губернских ведомостях" 24 мая сапраўднага, без цэнзурных скажэнняў, тэксту пушкінскага "Памятника"[5].

У юбілейныя дні ў Віцебску прадаваліся поўны збор твораў Пушкіна ў пяці тамах пад рэдакцыяй П.А.Яфрэмава, асобныя творы ("Евгений Онегин", "Борис Годунов", "Полтава", "Капитанская дочка", "Дубровский" і іншыя), літаратура пра творчасць і жыццё Пушкіна (успаміны Л.М.Паўлішчава, пляменніка паэта, артыкулы В.Р.Бялінскага пра Пушкіна, прамова Ф.М.Дастаеўскага на адкрыцці помніка Пушкіну ў Маскве ў 1880 г., біяграфічныя нарысы А.М.Скабічэўскага і іншае). Толькі за адзін месяц у Віцебску было прададзена 45 тыс. экземпляраў твораў Пушкіна[6]. З 18 сакавіка ў горадзе праводзіўся збор ахвяраванняў на пабудову памяшкання для публічнай бібліятэкі імя Пушкіна. У архіўных матэрыялах змешчана шмат цікавых звестак аб правядзенні пушкінскіх святаў у многіх вучэбных установах. Так, у прыбранай кветкамі актавай зале Віцебскага першаразраднага сямікласнага жаночага вучылішча "на сцяне ў залатой раме быў змешчаны партрэт Пушкіна з надпісам: "Не кажыце мне: ён памёр – ён жыве". Пад партрэтам змяшчаўся бюст паэта. Дзяўчынкі, якія ўвасаблялі музы мастацтва (паэзіі, жывапісу і музыкі), у заключэнне ўрачыстага юбілейнага свята ўсклалі на галаву бюста паэта срэбны вянок, прыпадобнены да лаўравага[7]. Ад імя дырэктара Віцебскага мужчынскага вучылішча Ф.І.Ціхаміра і яго выхаванцаў у святочныя дні быў адпраўлены ў Святагорскі манастыр, месца вечнага спачыну вялікага рускага паэта, раскошны металічны вянок з вершаваным надпісам на стужцы: "Во всемирном пантеоне твой уже воздвигся лик. Тебя чествует и славит всяк народ и всяк язык". Вянок усклалі на помнік Пушкіну каля сцяны старажытнага Успенскага сабора Святагорскага манастыра[8].

Пушкінскія святы ва ўсіх вучылішчах Віцебскай губерні праходзілі па вызначанай праграме. Чыталіся пушкінскія вершы і вершы Я.П.Палонскага, А.М.Пляшчэева і іншых паэтаў, прысвечаныя памяці Пушкіна, выконваліся музычныя і вакальныя творы на словы Пушкіна, інсцэніраваліся пушкінскія драмы і паэмы. На святочных вечарах асабліва падкрэслівалася, што пушкінскія дні – гэта, у першую чаргу, свята асветы. Выкладчыкі славеснасці засяроджвалі ўвагу вучняў на значэнні Пушкіна як паэта-асветніка і гуманіста, глыбокага псіхолага, настаўніка і выхаваццеля юнацтва і палымянага патрыёта, які "хварэў смуткамі сваёй радзімы і цешыўся яе радасцямі"[9]. Адзначалася таксама, што выпуск навучэнцаў 1899 г. "можна назваць пушкінскім", паколькі ён супадае з пушкінскімі днямі. Выказваліся пажаданні, каб творы Пушкіна, падораныя вучням у святочныя дні, дапамагалі ім любіць "сваю радзіму так, як Пушкін яе любіў"[10].

Навучэнцы-выпускнікі на святочных вечарах не заставаліся абыякавымі гледачамі. Чытанне пушкінскіх вершаў у актавых залах выклікала ў іх захапленне. "Здавалася, дух Пушкіна нябачна прысутнічаў сярод удзельнікаў свята і запальваў у іх сэрцах свяшчэнны агонь любові да Айчыны"[11].

Адзначаючы вялікі энтузіязм віцебскай інтэлігенцыі, яе бязмежную любоў да Пушкіна, "Витебские губернские ведомости" з абурэннем паведамлялі аб тым, што ў асобных паветах мясцовыя ўлады не маюць ніякага ўяўлення аб творчасці вялікага паэта. Так, Іван Козыраў, жыхар мястэчка Кублічы Лепельскага павета, адзначае, што "калі на мясцовым валасным праўленні разглядалася пытанне аб ушанаванні памяці Пушкіна і было прапанавана ахвяраваць пэўную суму на пушкінскія святы, то большасць прысутных адразу закрычала: "Які там Пушкін? Мы не бачылі і не ведаем і справы мець не хочам". Некаторыя цішком згаджаліся сёе-тое ахвяраваць, але, падбухтораныя іншымі, адмовіліся ад гэтай думкі. У рэшце рэшт было сабрана... 5 рублёў, выручаных ад продажу камення і цэглы, што засталіся пасля нядаўняга пажару вучылішча". Але пайшоўшы на "ўступку", мясцовыя ўлады пакаралі сялян, якія настойвалі на ахвяраваннях. Яны адмовіліся будаваць школу для "мужыцкіх дзяцей" у гонар Пушкіна[12].

Глыбокае абурэнне віцебскай інтэлігенцыі выклікаў таксама той факт, што асобныя прадпрымальнікі спрабавалі выкарыстаць пушкінскі юбілей для асабістай нажывы. Адзін прадпрымальны заможны жыхар Віцебска, нехта Веньямін Імянітаў, прыдумаў азартную гульню "Дуэль Пушкіна". "Сутнасць гэтай гульні заключалася ў тым, што ўдзельнікі яе павінны страляць у надпіс на мішэні "Дантэс". Мішэнь падчас стралянiны рухалася злева направа, і таму лёгка было пацэліць у другі надпіс – "Пушкін", але гэтага патрабавалася пазбягаць пад пагрозаю штрафу". Гэта гульня была названа ў "Ви-

тебских губернских ведомостях" "неразумнаю і непрыстойнаю, бо яна абражае памяць вялікага паэта". "Ні адзін прыстойны чалавек, які лаважае вялікага паэта – гонар Расіі, – гаварылася ў карэспандэнцыі, – не будзе гуляць у гэту гульню. А.С.Пушкіну не патрэбны ігракі-"абаронцы", якія, цэлячыся ў Дантэса, будуць пападаць у паэта і плаціць за гэта толькі штрафы". Імянітаў нават параўноўваўся з сумна вядомым Герастратам. Гэта было яўным перабольшаннем. Але выступленне віцебскай інтэлігенцыі супраць прафанацыі, за спыненне бессаромнай спекуляцыі "святым для кожнага сумленнага чалавека імем Пушкіна" было ва ўсіх адносінах справядлівым і цалкам апраўданым[13].

Вядомы віцебскі літаратуразнавец, гісторык і краязнавец В.К.Стукаліч, сябар пісьменніка Г.І.Успенскага, адзначаў, што святкаванне стагоддзя вялікага рускага паэта-гуманіста спатрэбілася для таго, каб грамадства лепш зразумела Пушкіна. "Масавыя выданні пушкінскіх твораў, якія ў пушкінскія дні" былі пушчаны ва ўжытак, не засталіся бясследнымі ў гісторыі нашай асветы, а пушкінскія запаветы і ідэалы сталі вернымі і няўхільнымі даведнікамі ў нашым жыцці". А для лепшай папулярызацыі Пушкіна, на думку Стукаліча, павінен быць выдадзены збор пушкінскіх твораў з добрым каментарыем; неабходна акадэмічнае выданне пушкінскіх твораў[14].

На старонках "Витебских губернских ведомостей" настойліва гучаў заклік напісаць навуковую добрасумленную праўдзівую біяграфію А.С.Пушкіна і адначасова выказваліся пажаданні, каб усе творы вялікага паэта сталі здабыткам шырокіх народных мас.

[1] НАРБ. Ф.1297, воп.1, спр.6179, арк 1–3; ф.1416, воп.6, спр.637, арк.781; ф.3157, воп.1, спр.181, арк.25, 27.
[2] Там жа. Ф.1430, воп.1, спр.7223, арк.11; спр.35043, арк.19, 20,23,43.
[3] Там жа. Ф.1416, воп.6, спр.606, арк.1338, 1487, спр.614, арк.98.
[4] Там жа. Спр.614, арк.144, 1338.
[5] Там жа. Спр.606, арк.1239, 1251.
[6] Там жа. Ф.2507, воп.1, спр.2310, арк.61.
[7] Там жа. Ф.1416, воп.6, спр.606, арк.1355, 1356; спр.614, арк.75.
[8] Там жа. Арк.1418, 1452, 1453, 1462.
[9] Там жа. Ф.2507, воп.6, спр.2310, арк.74, 75.
[10] Там жа. Ф.1416, воп.6, спр.614, арк.382.
[11] Там жа. Ф.2507, воп.6, спр.2310, арк.31, 32.
[12] Там жа. Ф.1416, воп.6, спр.614, арк.4.
[13] Там жа. Спр.605, арк.963; спр.606, арк.169, 963; спр.614, арк.394, 642; спр.620, арк.220; спр.630, арк.3, 218, 221, 224, 225.
[14] Там жа. Спр.606, арк.1480; спр.614, арк.620; спр.854, арк.319–320.

*А.В.МАРОЗАЎ*

## УСХОДНЕСЛАВЯНСКАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА 20–30-х гг. ЯК СВОЕАСАБЛІВАЯ НАВУКОВА-МЕТАДАЛАГІЧНАЯ СІСТЭМА

Працы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх фалькларыстаў міжваеннага перыяду ўяўляюць значную гістарыяграфічную цікавасць і ўжо былі аб'ектам навуковага аналізу. Работы І.П.Беразоўскага, В.М.Гацака, В.Я.Гусева, А.С.Фядосіка і іншых вучоных па гісторыі ўсходнеславянскай фалькларыстыкі забяспечылі выхад гістарыяграфіі з рамак даламожнай галіны, якая давала даследчыку інфармацыю біяграфічнага характару або даведкі аб змесце папярэдняй літаратуры па той ці іншай праблеме. Са зборнікаў гістарыяграфічнага характару найбольшую цікавасць выклікае "Славянская фалькларыстыка. Нарысы развіцця"[1]. У адрозненне ад прадстаўнікоў марксісцкай фалькларыстыкі (М.К.Азадоўскі, Ю.М.Сакалоў), якія разглядалі гісторыю навукі як паслядоўную змену даследчыцкіх напрамкаў і школ, аўтары выдадзенага ў Кіеве зборніка робяць важны тэарэтычны вывад аб паэтапным развіцці фалькларыстыкі, што выяўляецца на кожным гістарычным этапе ў выглядзе дынамічнай сістэмы суіснуючых школ і напрамкаў.

Патрабаванням сучаснай фалькларыстыкі найбольш адпавядае праблемны прынцып гістарыяграфічных росшукаў. Таму мэта дадзенага артыкула – паказаць своеасаблівасць прынцыпова новай фалькларыстычнай метадалогіі, фарміраванне якой адбылося ў спецыфічных умовах грамадскага і культурнага развіцця Савецкага Саюза.